«ра», «ла», «рѣ», «лѣ». Для размежавання гэтых з'яў неабходна ўлічваць, што спрадвечныя спалучэнні «ра», «ла», «рѣ», «лѣ» характэрны для усіх слав. моў: стараж.-слав. «правьда», бел. «праўда», польск. «prawda»; стараж.-слав. «крѣпъкъ», рус. «крепкий», польск. «krzepki».

*С.У.Шахоўская.*

**ПОЯС**, пас, доўгая вузкая стужка тканіны, скуры ці інш. вязанага, плеценага, вітага матэрыялу, якой падпяразваюцца. Неад'емная частка нац. адзення беларусаў. Падпяразвалі кашулі і верхняе адзенне, на П. і за П. насілі прылады працы (нож, сякеру), прадметы ўжытку (шабету, капшук, грабеньчык) і інш. З П. звязаны розныя абрады, павер'і, замовы, варажба. П. дарылі маладой на вяселлі, яна завязвала П. родзічам жаніха; вузкім П. (спавівачом) спавівалі немаўлят, тканым невял. П. (набіракам) мацавалі збан з вадою, ідучы ў поле, лес. У Беларусі бытавалі пераважна П. тканыя, плеценыя і вітыя. Даўнія спосабы пляцення: на пальцах, «на вілачцы», «на сцяне». Шырыня П. да 28 см, даўж. да 5 м. Арнамент звычайна геаметрычны — падоўжныя, папярочныя і косыя палоскі, крыжыкі, грабеньчыкі, ромбы. Колер найчасцей чырвоны з шарганеннем чорнага, зялёнага, белага. Шматколерныя ўзоры характэрны для П. Зах. Палесся. Аздаблялі кутасамі, махрамі, бісерам, уплеценым паміж тканымі палоскамі, саламянымі ўстаўкамі, нашытымі кавалачкамі тканіны. Сусветна вядомы шаўковыя *слуцкія паясы*.



*Сучасныя беларускія **паясы**.*

**ПРААБРАЖЭНСКІ** Уладзімір Барысавіч (н. 15.7.1950, г. Гродна), беларускі архітэктар. Скончыў Брэсцкі інжынерна-буд. ін-т (1972). Працаваў у ін-це «Гроднаграмадзянпраект». У 1988—93 і з 1998 гал. архітэктар праектнага ўпраўлення «Гроднажылбуд», у 1994—97 начальнік ўпраўлення архітэктуры і горадабудаўніцтва Гродзенскага гарвыканкама. Асн. работы ў Гродне: адм. будынкі абл. ўпраўлення Мін-ва ўнутраных спраў па вул. Акадэмічная (1968—77), Дома тэхнікі па вул. Горкага (1977—84), буд. арг-цый (офіс «Гроднажылбуда»; 1987—88), жылыя дамы па вуліцах Горкага (1974—75), Сав. Пагранічнікаў, на пл. Дзекабрыстаў (1998—99), у мікрараёне Вішнявец (1999—2000); забудова мікрараёна Перасёлка 3 (1975—77); жылы комплекс г.п. Рось Ваўкавыскага р-на (1992—97). Дзярж. прэмія Беларусі 1998.



*У.Б.**Праабражэнскі**.*

**ПРАВАЛІНСКІ** Уладзімір Міхайлавіч (н. 3.9.1948, г. Орша), беларускі эстрадны спявак. Засл. дзеяч культуры Беларусі (1991). Засл. артыст Беларусі (1994). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1977). У рэпертуары песні сучасных бел. кампазітараў: «Афганістан», «Ліст з 45-га», «Майскі вальс», «Салаўі Хатыні» І.Лучанка, «Дзень нараджэння кахання», «Дачка багоў», «Рэйс на Мінск», «Шлях да цябе», «Яніна» Э.Зарыцкага і інш.



*У.М.**Правалінскі**.*

**ПРАВАПІС**, тое, што *арфаграфія*.

**ПРАВАСЛАЎЕ**, адна з буйнейшых галін *хрысціянства* разам з *каталіцызмам* і *пратэстантызмам*. П. склалася ў выніку размежавання з рымска-каталіцкай царквой, якое завяршылася ў 11 ст. Аснову веравучэння складаюць Свяшчэннае пісанне (Біблія) і Свяшчэннае паданне (працы айцоў царквы, пастановы ўсяленскіх сабораў і інш.). Для П. характэрна традыцыйнасць, прыярытэт каштоўнасцей і ўстановак, якія склаліся гістарычна. У праваслаўным свеце рэалізуецца ідэя гармоніі адносін царквы і дзярж. улады, спалучэння вядучай паліт. і эканам. ролі дзяржавы і духоўнай дзейнасці царквы. Фундаментам праваслаўнай набожнасці з'яўляецца аскетызм, які ўключае розныя формы самаабмежавання, пасты, адмет-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

ны малітоўны і духоўна-маральны вопыт. Важнае месца ў духоўнай традыцыі П. займае шанаванне абразоў, цэнтр. значэнне — шанаванне святых. Уплыў праваслаўнай духоўнасці стаў вызначальным у працэсе фарміравання асн. тэндэнцый развіцця ладу жыцця, маральнай свядомасці, маст. культуры, л-ры і філасофіі ўсх.-слав. народаў, у т.л. беларусаў. Хрысціянства ў яго ўсх. форме П. ўведзена на землях Беларусі ў 10 ст. як дзярж. рэлігія. Год заснавання Полацкай праваслаўнай епархіі (992) лічыцца пачаткам існавання праваслаўнай царквы ў Беларусі. Адначасова з Полацкам цэнтрамі П. быў Тураў (Жыткавіцкі р-н), дзейнічалі Полацкая і Тураўская праваслаўныя епархіі. Ефрасіння Полацкая заклала асновы кніжнай справы, традыцыі перапіскі рэліг. тэкстаў на тутэйшых землях. На тэр. Беларусі былі створаны найб. стараж. рукапіснае *Тураўскае Евангелле*, а таксама Аршанскае, Друцкае, Лаўрышаўскае, Полацкае Евангеллі. Цэнтрамі праваслаўнай духоўнасці і культуры з'яўляліся манастыры, пры якіх ствараліся скрыпторыі, іканапісныя школы. Сваёй літ. і асветніцкай дзейнасцю вядомы Кірыл Тураўскі. У ВКЛ былі закладзены характэрныя для бел. грамадства традыцыі поліканфесійнасці і талерантнасці. П. было дамінуючай канфесіяй на працягу 13—16 ст. У выніку Брэсцкай царк. уніі 1596, калі праваслаўная царква ў Беларусі і Украіне арганізацыйна аб'ядналася з каталіцкай, была створана ўніяцкая царква. На працягу 17—18 ст. большасць праваслаўных прыходаў была пераведзена ва ўніяцтва. Дзейнічалі праваслаўныя брацтвы, якія змагаліся за захаванне П. ў Рэчы Паспалітай, за храмы і манастыры. Пасля далучэння зямель Беларусі да Рас. імперыі (1772—95) адбывалася актыўнае аднаўленне пазіцый П., пачала ажыццяўляцца палітыка замацавання праваслаўнай царквы як пануючай у дзяржаве. Былі адноўлены Полацкая і інш. праваслаўныя епархіі. На Полацкім царк. саборы 1839 было прынята рашэнне аб уз'яднанні ўніяцкай царквы з праваслаўнай. Тэр. сучаснай Беларусі ўваходзіла ў склад Літоўскай, Мінскай, Магілёўскай, Полацкай праваслаўных епархій. У 1930-я гг. дзейнасць праваслаўнай царквы ў БССР была фактычна спынена, зачынены амаль усе храмы. На тэр. Зах. Беларусі, якая ў 1921—39 уваходзіла ў склад Польшчы, у 1922—25 была створана Польск. аўтакефальная праваслаўная царква, якая ўключала 5 епархій. Некаторае ажыўленне царк. жыцця назіралася ў гады Вял. Айч. вайны. У 1942 сабор епіскапаў Бел. праваслаўнай царквы абвясціў аб стварэнні Бел. аўтакефальнай праваслаўнай царквы, прыняў рашэнне аб аднаўленні 6 праваслаўных епархій, але кананічна царква не была аформлена. Да канца 1950-х гг. амаль усе епархіі на тэр. БССР былі скасаваны, епіскапы не прызначаліся. Адзінай дзеючай епархіяй заставалася Мінская. У канцы 1980-х гг. адбылася рэарганізацыя структуры праваслаўнай царквы ў Беларусі. На Архірэйскім саборы 1989 было прынята рашэнне аб стварэнні Бел. экзархата Рус. праваслаўнай царквы на чале з мітрапалітам мінскім Філарэтам. У склад экзархата ўвайшлі епархіі і манастыры, якія знаходзіліся на тэр. Беларусі. У 2015 Бел. праваслаўная царква ўключала 15 епархій (Бабруйскую, Барысаўскую, Брэсцкую, Віцебскую, Гомельскую, Гродзенскую, Лідскую, Магілёўскую, Маладзечанскую, Мінскую, Навагрудскую, Пінскую, Полацкую, Слуцкую, Тураўскую). Дзейнічаюць 1582 праваслаўныя прыходы, 1597 храмаў, 1655 святароў, 14 мужчынскіх і 20 жаночых манастыроў, Мінская духоўная акадэмія і Мінская духоўная семінарыя (в. Жыровічы Слонімскага р-на), духоўныя вучылішчы, выдаецца рэліг. л-ра. З 2013 царкву ўзначальвае мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Павел. Праваслаўная царква ў Беларусі прыкладае намаганні да захавання канфесійнай згоды на тэр. краіны, для міжнац. і міжкульт. дыялогу.

*В.Р.Языковіч.*

**ПРАВАТО́РАЎ** Генадзь Панцеляймонавіч (11.3.1929, Масква — 4.5.2010), расійскі і беларускі дырыжор, педагог. Нар. артыст Расіі (1981). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю па класах фп (1952) і дырыжыравання



*Г.П.Праваторaў.*

(1956). З 1960 працаваў у муз. тэатрах Расіі і Украіны. У 1984—89 гал. дырыжор Дзярж. тэатра оперы і балета Беларусі, з 1994 маст. кіраўнік і гал. дырыжор Мінскага духавога аркестра «Няміга», з 1988 гал. дырыжор Дзярж. акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь, у 2002—03 гал. дырыжор і маст. кіраўнік сімф. аркестра Белдзяржтэлерадыёкампаніі. Адначасова з 1986 выкладаў у Бел. акадэміі музыкі (з 1994 праф.). Сярод работ на бел. сцэне: оперы «Вайна і мір» С.Пракоф'ева (1985), «Кавалер руж» Р.Штрауса (1987), «Візіт дамы» С.Картэса (1995), «Хаваншчына» М.Мусаргскага (2003); балеты «Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага, «Вясна свяшчэнная» І.Стравінскага (абодва 1986), «Рамэа і Джульета» С.Пракоф'ева (1988), «Страсці («Рагнеда»)» А.Мдывані (1995); аперэта «Мефіста» У.Кандрусевіча (2002) і інш. Дзярж. прэмія Беларусі 1997.

**ПРАДМЕ́СЦЕ**, частка забудовы сярэдневяковага горада, якая знаходзілася па-за яго абарончымі мурамі. На тэр. Беларусі П. развіліся з пасадаў у стараж. гарадах, якія ўзнікалі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ